*УДК 008:[821.161.34:821.111]*

***А.Л. Сяліцкі,***
*выкладчык кафедры мастацкай і педагагічнай адукацыі БДПУ*

# АКСІЯЛАГІЧНЫ ЗМЕСТ КАНЦЭПТА "ЗЯМЛЯ" Ў МАСТАЦТВЕ ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ ХХ ст. (на матэрыяле твораў Я. Коласа "Новая зямля" і Т.С. Эліота "Бясплодная зямля")

Спецыфіка культурнай прасторы першай чвэрці ХХ ст. выяўляецца ў сінхронным супастаўленні твораў мастацтва розных культурных традыцый. У працэсе такога аналізу відавочнымі становяцца агульныя і адметныя рысы ў развіцці нацыянальных культур. Разам з тым, выяўляюцца аксіялагічныя вектары эпохі. У 20-х гадах ХХ ст. з'явіліся паэтычныя творы "Бясплодная зямля" (1922) Т.С. Эліота (1888-1965) і "Новая зямля" (1923) Я. Коласа (1882-1956). Нягледзячы на розьнасць як мастацкіх канцэпцый аўтараў, так і гісторыка-культурных умоў пры напісанні паэм, можна лічыць агульным у абодвух паэтаў імкненне да стварэння карціны свету, адэкватнай эпосе, вызначэння перспектываў і шляхоў духоўнага развіцця чалавецтва, якое апынулася ў сітуацыі цывілізацыйнага крызісу. Адным з канцэптуальных вобразаў у абодвух творах выступае *зямля*, якая ўвасабляе сабой агульнае для ўсіх людзей жыццёвае асяроддзе, універсальны пачатак быцця.

Варта адзначыць, што названыя паэмы ствараюць пейзажныя карціны эпічнага маштабу, у якіх вобраз культурнай прасторы ў многім фарміруецца з дапамогай арганічнай узаемасувязі прыроднага і чалавечага космасу. Дзеянні і думкі людзей у творах карэлююць з прыродным быццём, вызначаюць характар і настрой пейзажных апісанняў. Карціны прыроды абумоўліваюць існаванне чалавека, вызначаюць фактар фарміравання духоўнага свету асобы. Апошняе асабліва выразна прасочваецца ў паэме Я. Коласа, дзе вобраз прыроднай гармоніі выступае эталонам грамадскіх зносін. У творы Т.С. Эліота падводзіцца своеасаблівы вынік тысячагадовай гісторыі чалавецтва, даецца каштоўнасная ацэнка духоўнага стану еўрапейскага грамадства.

Назва паэмы *"Бясплодная зямля"* задае выразна акрэслены аўтарскі погляд на сучаснасць: зямля, якая стала пустэчай, выступае метафарай маральнага разняволення соцыуму. Невыпадкова, што адной з цэнтральных тэм твора з'яўляецца "смерць-у-жыцці" [1]. Герой паэмы (ён не мае пэўнай ідэнтыфікацыі з пэўным персанажам) страціў жыццёвыя сілы, яго існаванне пазбаўлена сэнсу. Гэта думка аўтара адлюстравана ў эпіграфе, дзе размова ідзе пра Сівілу. Сівіла, якая атрымала ад багоў, згодна з грэчаскай

РЕПОЗИТОРИЙ

міфалогіяй, бессмяротнасць, але не вечную маладосць, пераўтварылася з цягам часу ў жменьку попелу, аднак ні памерці, ні весці паўнавартаснае жыццё не можа. Гэта метафара адлюстроўвае думку аўтара пра тое, што сучасны чалавек фізічна існуе, аднак ягоны духоўны свет вынішчаны. У Т.С. Эліота чалавек дэіндывідуалізаваны, чужы свету, соцыуму і сабе. Абсалютызацыя прымітыўнай пачуццёвасці вядзе да атрафіі пачуццяў і думак: знешняя актыўнасць аказваецца на справе бяздзейнасцю, бязмэтавым наборам рухаў.

Страта духоўнасці, якая пераўтварае існаванне людзей ў бессэнсоўны працэс, патрабуе выхаду з гэтага крызіснага становішча – пошуку асноў новай духоўнасці. Такі погляд на рэчы ў многім абумоўлены хрысціянскай арыентацыяй аўтара, для якога страта людзьмі шчырай веры ў Бога вядзе да духоўнай спустошанасці. У героя Т.С. Эліота няма імкнення ні да дабра, ні да свядомага зла (Ш. Бадлер). Чалавек пераўтвараецца ў аўтамат, які выконвае пэўныя функцыі, але не бачыць за ўсімі рухамі ніякай мэты.

Гэта тэма знаходзіла адлюстраванне ў многіх сучаснікаў паэта, напрыклад, у творчасці мастака-дадаіста Дж. Гроша (1893-1959). На яго палатне “Даўм выходзіць замуж” (1920) паказана сямейная пара. Калі параўнаць гэты твор з класічнымі ўзорамі, такімі, як “Партрэт мужа і жонкі Арнальфіні” (1434) Я. ван Эйка (1395-1441), становіцца відавочным гратэск аўтара. Жанчына, якая на карціне галандскага мастака сваім вобразам узыходзіць да выяваў Мадонны, у творы Дж. Гроша нагадвае распусную жанчыну. Мужчынскі вобраз пераўтвораны ў падабенства механічнага аўтамата, паколькі яго функцыя зведзена да выконвання запраграмаваных аперацый, зададзеных нейчай воляй. Чалавек, такім чынам, зводзіцца з п’едэстала богападобнай існасці і трансфармуецца ў абездухоўленую рэч. Гэта падкрэслівае і пустэльны гарадскі пейзаж на заднім фоне, у якім не адчуваецца наяўнасці жыцця. Невыпадкова, што ў адным са сваіх лістоў мастак пісаў: “Я поўнасцю перакананы, што гэта эпоха рухаецца да сваёй пагібелі – наш апаганены рай” [3, с. 87]. “Апаганены рай” – своеасаблівы сэнсавы адпаведнік “бясплоднай зямлі”.

Аксіялагічны змест мастацкага пейзажа ў паэме “Бясплодная зямля” раскрывае цэнтральную тэму твору: катастрафічны стан сучаснага чалавецтва, якое страціла асновы духоўнасці. Вобразы прыроды выступаюць адным з галоўных канструктыўных элементаў універсальнай карціны быцця. Пейзажныя карціны напоўнены шэрагам метафарычных вобразаў, у якіх канцэнтруецца сэнсавае ядро аўтарскай думкі. У главе “Пахаванне

РЕПОЗИТОРИЙ

Памерлага” Т.С. Эліот паказвае надыход вясны, які абуджае ў душы чалавека фізічны, матэрыяльны аспект ягонай асобы:

Апрель, беспощадный месяц, выводит
Сирень из мертвой земли, мешает
Воспоминанья и страсть, тревожит
Сонные корни весенним дождем [4, с. 149].

У дадзеных радках не адчуваецца радасці ад гэтага абуджэння: красавік названы «беспощадным месяцем», ён «тревожит сонные корни». Вясна актывізуе ў прыродзе яе першародную сілу, якая знешне прымушае чалавека да актыўнасці. Аднак гэта актыўнасць “сляпая” як і сам вітальны імпульс, яна не мае вышэйшай мэты. Для хрысціянска-арыентаванага Т. Эліота аснову чалавечай дзейнасці павінны складаць абсалютныя духоўныя каштоўнасці, заснаваныя на веры ў Бога. Аднак сучаснік паэта, на думку апошняга, пазбаўлены і вітальнай энергіі, і шчырай веры. Ён – пусты, бясплодны, таму для яго больш прымальнай парой года з’яўляецца зіма:

Зима дает нам тепло, покрывает
Землю снегом забвенья, лелеет
Каплю жизни в засохших клубнях [4, с. 149].

Зіма выступае тым часавым прамежкам, калі чалавек пагружаны ў вымушаную бяздзейнасць, аднак гэтая бяздзейнасць зноў-такі абумоўлена знешне. Асоба знаходзіцца ў становішчы, калі яе ўласная воля атрафіравана, жыццё ператвараецца ў бязмэтавае існаванне, “смерць-у-жыцці”. Вясна актывізуе яго пачуцці, але на ўзроўні грубай пачуццёвасці, пазбаўленай духоўных першаасноў, і гэта вядзе да “адраджэння-ў-смерць” [1]. Культ у грамадстве плоцкага пачатку і страта веры вядзе, на думку Т.С. Эліота, да таго, што чалавек губляе цэласнасць светабачання, карціна свету дзеліцца на асобныя, не звязаныя паміж сабой фрагменты. Перарываецца сувязь з традыцыяй, мінулым і не існуе глебы для пабудовы будучыні:

Что там за корни в земле, что за ветви растут
Из каменистой почвы? Этого, сын человека,
Ты не скажешь, не угадаешь, ибо узнал лишь
Груду поверженных образов там, где солнце палит,
А мертвое дерево тени не даст, ни сверчок утешенья,
Ни камни сухие журчанья воды [4, 149-150].

А.А. Аствацатураў у манаграфіі «Т.С. Эліот і яго паэма “Бясплодная зямля”» ўбачыў у вобразах “каранёў”, “галінаў” (падобна да “сонных каранёў” і “клубняў” у пачатку главы “Пахаванне Памерлага”) прыпадабненне апавядальніка да расліны (Бога расліннасці) [1]. Разам з тым, можна, на нашу думку, разгледзець вобразы “каранёў” і “галін” як метафары

РЕПОЗИТОРИЙ

прычынна-выніковых сувязяў у свеце, якія схаваныя ад свядомасці сучасных людзей з-за іх духоўнай недасканаласці. Чалавек не можа ні зразумець (“ты не скажешь”), не інтуітыўна адчуць (“не угадаешь”) прыроду рэчаў і з’яў, бо ўвесь свет для яго стаў “каменистой почвой». Ад мінулага засталася толькі “груда поверженных образов» - развянчаных ідэалаў, на месцы якіх грамадства не здолела пабудаваць новай, адэкватнай запатрабаванням часу сістэмы каштоўнасцей. Дэсакралізаваная карціна сучаснага паэту жыцця нагадвае вобраз пустыні, дзе «солнце палит», «мертвое дерево тени не даст», «ни камни сухие журчанья воды». У кантэксце гэтых вобразаў вада выступае сімвалам боскай міласэрнасці, якая напаўняе зместам чалавечае існаванне, робіць веру “дрэвам жывым”. Захаваць сэнс уласнага жыцця ў бясплоднай прасторы сучаснасці можна толькі з усведамленнем неабходнасці шчырага прыняцця сістэмы абсалютных каштоўнасцяў, якія дае вера ў Бога:

Лишь
Тут есть тень под этой красной скалой
(Приди же в тень под этой красной скалой),
И я покажу тебе нечто, отличное
От тени твоей, что утром идет за тобою,
И тени твоей, что вечером хочет подать тебе руку;
Я покажу тебе ужас в пригоршне праха [4, с. 150].

Вобраз «красной скалы» выступае ў прыведзеным урыўку сімвалам Бога. «Тень» можна разглядаць як вытворную функцыю боскага быцця – рэлігійную веру чалавека. Гэтая вера трансцэндэнтная зямному пачатку, яна адкрывае магчымасць пабудовы цэласнай карціны свету і ўсведамлення асобай свайго належнага месца і ролі ў ёй. Менавіта таму «тень» ад «красной скалы» прынцыпова адрозніваецца ад «тени», што «утром идет за тобой», «вечером хочет подать тебе руку». Відавочнай становіцца думка аўтара аб тым, што для нармальнага развіцця грамадства, для пераемнасці традыцый у ім патрэбна цвёрдая сістэма духоўных каштоўнасцей, заснаваная не на чалавечых законах (якія, як гэта паказваецца ў тэксце паэмы, вядуць да маральнага разняволення), а на фундаменце веры ў Бога. Гэта ідэя з асаблівай выразнасцю разгортваецца ў пятай частцы паэмы “Што сказаў Гром”. Гром у кантэксце твору сімвалізуе Бога, таму ўжо сама назва стварае атмасферу напружанага чакання адказу на асноўныя праблемы, закранутыя аўтарам. Гэту канцэнтрацыю на пошуку шляхоў выхаду з катастрафічнай духоўнай сітуацыі часу падкрэсліваюць пейзажныя карціны. Зноў, толькі ўжо ў больш абагульненым, разгорнутым выглядзе паэт паказвае зямлю, пазбаўленую боскай міласэрнасці:

Нет здесь воды, всюду камень,

РЕПОЗИТОРИЙ

Камень и нет воды и в песках дорога.
Дорога, которая вьется все выше в горы,
Горы эти из камня и нет в них воды.
Была бы вода, мы могли бы напиться,
На камне мысль не может остановиться,
Пот пересох, и ноги уходят в песок [4, с. 161].

Вобраз гары ў кантэксце гэтых радкоў мяняе сваё сэнсавае значэнне на супрацьлеглае адносна вобраза “красной горы”. Горы тут можна разглядаць як сімвал марнасці чалавечых імкненняў у пошуку абсалюту, калі гэты пошук не заснаваны на падмурку веры. “В песках дорога” выступае метафарай працэсу пазнання, у якім адсутнічае арганічнае спалучэнне духоўнага і рацыянальнага напрамкаў. Такое пранікненне ў таямніцы свету можа даваць пэўную суму ведаў аб ім, весці «все выше в горы», аднак «нет в них воды» і на «камне мысль не может остановиться». Гэта значыць, што адно толькі спасціжэнне матэрыяльнага, акцэнтуацыя людзей на плоцкіх пачуццях пазбаўляе карціну свету цэласнасці, вядзе да маральнага крызісу. «О если бы только была вода средь камней», - усклікае апавядальнік, падкрэсліваючы тым самым важнасць думкі пра неабходнасць вяртання духоўных арыенціраў. Аднак “камень матэрыі” мёртвы (“горы гнилозубая пасть не умеет плевать”), а гром, вобраз Боскага слова, - “сухой бесплодный” і “без дождя”. У гэтым можна ўбачыць адносіны Т.С. Эліота да сучасных сусветных рэлігій, якія, на яго думку, ператварыліся ў сацыяльныя інстытуты з наборам пэўных рэгулюючых функцый, аднак страцілі “жывое” слова шчырай веры. Невыпадкова рака Тэмза ў паэме - сімвал еўрапейскай культуры, апаганеная (“дегтем и нефтью/ потеет река”), а Ганг - увасабленне старажытнаіндыйскай мудрасці, “обмелел”, страціў свае першапачатковыя крыніцы духоўнасці. Гэта думка падкрэсліваецца і вобразам старой капліцы:

В этой гнилостной впадине меж горами
Трава поет при слабом свете луны
Поникшим могилам возле часовни.
Это пустая часовня, жилище ветра,
Окна разбиты, качается дверь [4, с. 163].

«Пустая часовня» выступае сэнсавым адпаведнікам цэнтральнага вобраза бясплоднай зямлі, адлюстроўваючы духоўны заняпад эпохі, яе дэсакралізацыю. Уся прырода адчувае неабходнасць жыватворчага дажджу – “добрай весткі”. Яна прыходзіць у вобразе грому, які прыносіць тры словы на санскрыце: “Датта”, “Даядхвам”, “Дамьята” (“дай”, “спачувай”, “валодай”). Гэтыя словы, узятыя аўтарам з будыйскай легенды, выступаюць квінтэсэнцыяй яго думкі, адкрываюць магчымасці да духоўнага абнаўлення

РЕПОЗИТОРИЙ

чалавецтва. Менавіта ў такой паслядоўнасці павінна, як мяркуе паэт, ісці ўнутранае ўдасканаленне асобы: навучыцца дапамагаць сваім блізкім, аддаваць ім тое, у чым яны маюць патрэбу як духоўнага, так і матэрыяльнага характару; умець суперажываць праблемам іншых, браць іх боль і клопат на сябе. Выкананне першых дзвюх умоў дасць чалавеку магчымасць спасцігнуць сваё ўнутранае "Я", навучыцца кіраваць уласным лёсам ("лодка весело/ искусной руке моряка отвечала"). Аднак гэты ідэал можа ажыццявіцца толькі ў будучыні. Рэальнасць вымушае паэта зноў звярнуцца да вобраза караля-рыбака з легенды пра Святы Грааль, у валоданні якога апынулася бясплодная зямля:

Я сидел у канала
И удил, за спиною - безводная пустошь
Наведу ли я в землях моих порядок? [4, с. 164]

Адзначым, што ідэя "порядка" "в землях моих" з усёй паўнатою рэалізуецца ў творчасці Я. Коласа. У паэме "Новая зямля" яна выступае неад'емнай умовай гармоніі прыроднага і чалавечага быцця, знаходзіць адлюстраванне ў такіх мастацкіх канцэптах, як "лад", "суладдзе". Такое светаадчуванне выпрацоўвалася стагоддзямі ў выніку непарыўнай сувязі працоўнага чалавека з зямлёй. Хуткі цывілізацыйны прагрэс у пачатку ХХ ст. прывёў да парушэння адвечных сувязей чалавека і прыроды. У творы Т.С. Эліота праблема страты гармоніі не мае канчатковага вырашэння, аднак у канцы паэмы яшчэ раз паўтараюцца словы: "Датта. Даядхвам. Дамьята", за якімі ідзе "Шанти, шанти, шанти". Шанці азначае стан свядомасці пасля таго, як чалавек змог вырашыць праблему. У гэтым закладзены глыбінны сэнс твора, які выяўляецца ў тым, што людзі могуць вярнуць страчаную сувязь са светам і паміж сабой, дасягнуць пачуцця ўнутранага спакою і раўнавагі праз прыняцце ідэі духоўнага Абсалюту.

Калі Т.С. Эліот ідзе ў сваім творы ад адлюстравання катастрафічнага стану свету, у якім адбылася поўная страта каштоўнасных арыенціраў, да пошуку новых асноваў духоўнага развіцця чалавецтва, то Я. Колас будуе карціну свету наадварот, ад процілеглага. У першым раздзеле паэмы, які мае назву "Леснікова пасада", аўтар ставарае свайго кшталту мікрамадэль сусвету, у якой усё пабудавана па законах гармоніі. Леснікова сядзіба ў паэме выступае вобразам лакальнай тэрыторыі ў прыроднай і сацыяльнай прасторы, на якой чалавек жыве ў "суладдзі" з навакольным светам і з астатнімі людзьмі. Гэты вобраз з'яўляецца своеасаблівым камертонам да астатняй часткі паэмы, адносна якога падзеі і ўчынкі людзей набываюць каштоўнаснае вымярэнне. Апісанні прыроды ў раздзеле "Леснікова пасада" ствараюць гарманічны вобраз роднаснага чалавеку асяроддзя, поўнага

РЕПОЗИТОРИЙ

бясконцай разнастайнасці і ладу. Гэтаму садзейнічаюць ужытыя Я. Коласам характарыстыкі прыродных аб’ектаў: лес “цягнуўся гожаю падковай”; луг – “шырокі”, “жывы”, ён “міл і смуцен, як радзіма”; Нёман – “срэбраводны”; дубы стаяць “дружнай чарадою”, “як вежы”, “даўнейшых спраў вартаўнікамі”, “ззяюць грозна жараламі” і г.д. Выразнасць пластычных апісанняў прыроды ствараецца з дапамогай яскравай вобразнасці і сэнсавай ёмістасці коласаўскага “жывога” слова.

Пейзажныя карціны напоўнены адчуваннем першароднаснай вітальнай сілы. Праз яскравую бачнасць пейзажных апісанняў праяўляецца ісціна, увасобленая ў форме перажывання хараства навакольнага свету. Відавочна, што прырода выступае для людзей агульным этыка-эстэтычным ідэалам. Чалавек, адчуваючы хараство навакольнага свету, яго “лад”, “парадак”, імкнецца гэту гармонію зрабіць нормай для сваіх думак і дзеянняў. Чулая да хараства прыроды душа чалавека бачыць у ёй адухоўленую існасць, роднасную і блізкую сабе, арганічна ўспрымае прыродную прастору як “сваю зямлю”, “родны кут”. Такім чынам, адчуванне асобай уласнай знітаванасці з прыродай вядзе да выпрацоўкі трывалых норм духоўнасці, у падмурку якіх ляжыць “замілаванне жыццём” (А. Швейцар) ва ўсіх яго праявах, адчуванне ўкаранёнасці ў роднаю зямлю і непарыўнай сувязі з ёю, напоўненасць і багацце ўнутранага свету асобы.

Адштурхоўваючыся ад вобраза сусветнай гармоніі ў мініяцюры, Я. Колас шукае магчымасць рэалізацыі яе ў межах цэлага свету. Такім чынам, галоўны герой паэмы (Міхал) выступае персаніфікацыяй аўтарскага “праўдашукальніцтва”. Для Міхала асноўнай задачай з’яўляецца набыццё ўласнай зямлі для вядзення самастойнай гаспадаркі:

Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,
Каб з панскіх выпутацца пут,
І там зажыць сабе нанова:
Свая зямля – вось што аснова! [2, с. 67]

Імкненне Міхала “зажыць нанова” мае прачытанне не толькі на ўзроўні сацыяльным, але ўспрымаецца як заклік да перамен у самім падыходзе да жыцця, да абнаўлення ягон духоўных асноў. У паэме выразна прасочваюцца апісанні некалькіх жыццёвых асяроддзяў: леснікавай пасады, вёскі, панскага маёнтка, горада. Аднак нідзе, акрамя жытла лесніка, Я. Колас не бачыць годнага жыцця. Панскі маёнтак успрымаецца як сіла, якая накладае на працоўнага чалавека “путы”, пазбаўляе яго свабоды. У кантэксце паэмы леснікова пасада супрацьпастаўляецца вёсцы, бо там - “галда, там шум, цяснота” [2, с. 75]. Вёска – збіральны вобраз соцыуму, яго ніжэйшага слою. З-за цяжкага жыцця, “страшэннага сціску” людзі не могуць весці

РЕПОЗИТОРИЙ

паўнавартаснае існаванне. Увогуле, для Я. Коласа ўласцівым з'яўляецца выкарыстанне ў творах вобразаў шырокага прастору, разлегласці, шырыні як неад'емных умоў дасканалага быцця чалавека. Няма гэтай прасторы ў пейзажным апісанні горада:

На камяніцы камяніца,
Не згледзіш неба край за імі
І цісnuць сценамі сваімі [2, с. 264].

У прасторы горада чалавек губляе адчуванне роднасці з навакольным асяроддзем, якое было ва ўлонні прыроды, калі "з старасвецкімі дубамі/ Каротка знаўся, як з сябрамі":

А тут – адзін, бо ўсе чужыя,
Не знаеш, хто яны такія,
І сам для іх ты чужаніца [2, с. 263-264].

Апазіцыя "сябар" – "чужы", ужытая ў коласаўскім тэксце, выяўляе адну з галоўных праблем сучаснасці: адасобленасць жыцця людзей адзін ад аднаго, страта імі пачуцця ўзаемаперажывання, узаемадапамогі. Чалавек страчвае сувязі з навакольным (шырокім, жывым, разнастайным) светам, і замыкаецца ў вузкай прасторы ўласнага жыццёвага кола, не кампенсуючы іх напружанай духоўнай працай. Такое існаванне пераўтвараецца ў падманлівае падабенства паўнавартаснага жыцця, што выразна адлюстравана ў паэме Т.С. Эліота:

Призрачный город,
Толпы в буром тумане зимней зари,
Лондонский мост на веку повидал столь многих,
Никогда не думал, что смерть унесла столь многих [4, с. 151].

Людзі ў гэтай пейзажнай карціне – жывыя абалонкі, іх унутраны свет спустошаны, існаванне пазбаўлена мэты. Смерць іх "унесла" яшчэ пры жыцці, і горад жывых стаў прывідным горадам. Чалавек, адасобіўшыся ад усяго навакольнага, зняўшы з сябе ўсялякую адказнасць за іншых і за наступствы сваіх учынкаў, адасобіўся і ад самога сабе, бо страціў уласную ўнутраную цэласнасць. Гэта "духоўная сітуацыя часу" (К. Ясперс) аднолькава была адчута і Я. Коласам, і Т.С. Эліотам: каб вызваліцца ад ланцуга "дурной бясконцасці" (Г.В.Ф. Гегель) уласнага недасканалага існавання трэба памерці, каб уваскрэснуць у абноўленым выглядзе для новага жыцця. У гэтым кантэксце і словы мадам Сазострыс "Ваша смерць ад вады" (вады як сімвала боскай міласці, ачышчэння) з твора Т.С. Эліота і смерць Міхала можна разглядаць як ахвярапрынашэнне, неабходную ўмову пераўтварэння жыцця ў новую, больш дасканалую форму. У такім ракурсе

РЕПОЗИТОРИЙ

праблемы глыбокае сэнсавае напаўненне набываюць словы паміраючага Міхала:

Зямля... зямля... туды, туды брат,
Будуй яе... ты дай ёй выгляд...
На новы лад, каб жыць нанова... [2, с. 296]

Я. Колас у паэме неаднаразова выкарыстоўвае такія канцэпты, як “лад”, “суладдзе”, “парадак”, у якіх адлюстроўваюцца яго ўяўленні аб дасканалым чалавечым існаванні. Жыць на новы лад – значыць збудаваць “сваю”, “новую” зямлю па тых законах, якія складаюць асновы чалавечай духоўнасці: дабра, роднасці, добрасуседства, роўнасці і інш. Гэта не толькі валоданне пэўнай тэрыторыяй і гаспадаркай, але і трывалай сістэмай каштоўнасных арыенціраў - глебай ўнутранага ўдасканалення. Пры гэтых умовах чалавек можа захаваць і ўласную самадастатковасць, і “быць з суседзьмі ў згодзе”. Так фарміруюцца выхады коласаўскай думкі ў “свет шырокі”, якая з асаблівай сілай гучыць у заключных радках паэмы:

Прасторны шлях! Калі ж, калі
Ты закрасуеш на зямлі
І злучыш нашы ўсе дарогі? [2, с. 297]

Такім чынам, у гэтых радках, напоўненых пейзажнымі вобразамі, выразна прасочваецца ідэя сусветнай гармоніі, якая б аб’ядноўвала абноўленае чалавецтва. “Прасторны шлях”, які злучае “нашы ўсе дарогі” (“пуцінкі вузкія, крывыя”), выступае сімвалам агульнай справы, агульнага намагання людзей жыць у “суладдзі” адзін з адным, з адчуваннем у душы велічы, таямнічасці і хараства прыроды, а праз гэта годнасці і духоўнай высакароднасці самога чалавека. Менавіта ідэя духоўнага абнаўлення, выхаду на якасна новы ўзровень разумення асобы, прыроды і соцыуму выступае агульным аксіялагічным вектарам паэтычных твораў Я. Коласа і Т.С. Эліота.

РЕПОЗИТОРИЙ

ЛІТАРАТУРА

1. Аствацатуров, А.А. Элиот Т.С. и его поэма «Бесплодная земля» / А.А. Аствацатуров. – СПб. : Изд-во СПбГУ, 2000. – 240 с.

2. Колас, Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 8. Паэма “Новая зямля” / Я. Колас. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 347 с.

3. Хопкинс, Д. Дадаизм и сюрреализм. Очень краткое введение / Д. Хопкинс; пер. с англ. А.А. Крымова. – М. : Астрель : АСТ, 2009. – 224 с.

4. Элиот, Т.С. Бесплодная земля / Т.С. Элиот // Стихотворения и поэмы: [сборник; пер. с англ.]. – М. : АСТ, 2013. – С. 149-164.

SUMMARY

The article reveals by means of a semiotics approach the axiological content of the concept "land" in Y. Kolas' poem "The New Land" and T.S. Eliot's "The Waste Land". On the basis of the synchronic analysis the common and distinctive features of the authors' system of vaiues come to light. It is noted that the concept "land" reflects the cultural world view which was marked by the crisis in public life. At the same time, the authors introduce their own concept of spiritual revival. The common axiological vector includes the idea of spiritual renewal of mankind as will as qualitatively new level of understanding of interrelation between the individual, nature and society.

РЕПОЗИТОРИЙ